КРАІНА СУЦЭЛЬНАЙ ЦЕМРЫ ПЕРАТВАРАЕЦЦА Ў КРАІНУ СУЦЭЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЬЦІ

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 203 (1472) ‖ АЎТОРАК, 1 верасьня 1931 г.

ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ

У 1929—30 навучальным годзе БССР дабілася значных посьпехаў: усеагульным абавязковым навучаньнем тады было ахоплена 91 проц. дзяцей васьмігадовага ўзросту.

Мінулы 1930—31 навучальны год быў годам рашучай барацьбы за ажыцьцяўленьне дырэктыў 16 партзьезду. Усеагульнае абавязковае першапачатковае навучаньне было ўведзена ўжо для дзяцей трох узростаў—8,9 і 10 год. Школамі было ахоплена 97 проц. дзяцей гэтага ўзросту. Ня меншая ўвага была зьвернута на ўсеагульнае абавязковае навучаньне няпісьменных і малапісьменных падлеткаў ва ўзросьце 11—15 год. У выніку спэцыяльнымі школамі і асобнымі групамі пры лікпунктах было ахоплена 92,4 проц. падлеткаў гэтага ўзросту. У 1930—31 навучальным годзе было ўведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне на базе сямігодкі ў гарадох і фабрычна-заводзкіх раёнах БССР.

Беларусь, маючая ў сваім складзе насельніцтва розных нацыянальнасьцяй, да рэволюцыі ня мела нацменаўскіх школ, за выключэньнем некалькіх яўрэйскіх школ граматы. Дзякуючы правільнаму і няўхільнаму ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай політыкі, працоўныя ўсіх насяляючых БССР нацыянальнасьцяй атрымалі магчымасьць навучаць сваіх дзяцей на роднай мове.

Аб агромністым росьце нацменаўскіх школ гавораць лепш за ўсё лічбы: Летась па БССР было 816 комплектаў яўрэйскіх школ, 286 польскіх, 30—латыскіх, 14—літоўскіх, 45—украінскіх, 8—нямецкіх, 2—эстонскіх і 324 комплекты расійскіх школ 1-га концэнтру.

У прошлым навучальным годзе ўпяршыню ў БССР была організавана ў масавым маштабе дапамога дзецям беднаты, сярод якіх было распаўсюджана 300 тыс. пар абутку і на 2.260 тыс. р. адзежы. Але гэтага, зразумела, было недастаткова. У новым навучальным годзе дапамога беднаце будзе пастаўлена значна шырэй.

Гэтых посьпехаў Беларусь дасягнула ў рашучай барацьбе за генэральную лінію партыі, у бязьлітаснай барацьбе з вялікадзяржаўным шовінізмам—галоўнай небясьпекай на даным этапе, у бязьлітаснай барацьбе з беларускім контррэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам.

Вялікадзяржаўныя шовіністыя прабавалі „рэвізаваць" ленінскую нацыянальную політыку, выступаючы супроць беларусізацыі, супроць школ нацыянальных меншасьцяй.

У мінулым годзе давялося правесьці рашучую барацьбу па выкарчоўваньню спадчыны контррэволюцыйных беларускіх нацдэмаў, якія ў свой час шырока забясьпечылі школы падручнікамі, прасякнутымі буржуазнымі ідэямі і ўстаноўкамі.

Усім гэтым вылазкам агентаў клясавага ворага пролетарская грамадзкасьць Беларусі пад кіраўніцтвам КП(б)Б, давала рашучы адпор, а чырвонаштандарныя асьветнікі БССР сыстэматычна ачышчалі ад іх свае рады.

Перад намі стаіць задача—поўнасьцю выканаць плян абавязковага першапачатковага навучаньня, намечаны ЦК КП(б)Б: ахапіць школамі дзяцей ва ўзросьце 8—11 год поўнасьцю, школамі-курсамі няпісьменных і малапісьменных—падлеткаў 11—15 год, увесьці ўсеагульнае абавязковае навучаньне на базе сямігодкі для ўсіх дзяцей у гарадох і прамысловых цэнтрах, фабрычна-заводзкіх пасёлках і ў раёнах суцэльнай колектывізацыі.

Неабходна ўзмацніць тэмпы разгортваньня сеткі ФЗС, ШКМ, разгарнуць барацьбу за павялічэньне якасьці работы масавай школы і ператварэньне яе ў сапраўды політэхнічную школу.

Пролетарыят і працоўныя Беларусі пад ленінскім кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б)Б і ЦК КП(б)Б бязумоўна зломяць існуючую там-сям ураёнах і гарадох БССР опортуністычную недаацэнку культбудаўніцтва, і ў рашучай барацьбе за генэральную лінію партыі даб'юцца выкананьня і перавыкананьня ўсіх пастаўленых перад намі ў 1931—32 навучальным годзе задач у галіне ўсенавучу і політэхнізацыі школы.

„ЗКП" Б. Бялуга

Тодар Алесін

АДЗІНЫМ ФРОНТАМ

У новыя гмахі
рамонты
Лета, як цынк,
пераліт
і сеньня выходзім
фронтам
Глытаць удумлівасьць
літар.
Ізноў ад сьвежага
раньня
школу прабуджаючы
масы...
Ад золаку і
да
зьмярканьня
цьвітуць думкі
Леніна, Маркса...
Тэмпы ў вучобе
патроім
Да раласьць і за
ахвоту.
Ідзем бальшавіцкім
строем
Душыць за горла
цямноту.
Будзем змагацца
да конца
Зя край аднаго
сумленьня.
Краіна выйдзе на
сонца,
Выйдзе агульна—
пісьменнай.



І, ведаю я.—
жаданьні
ніжуцца ўсіх у
маністы:
на школы сьветлай,
прыбранай,
да школы
політэхнічнай.
На тых, хто лета
прахлястаў,
Гавеўна забыў
пра гэта—
абураны ўсе,
усе чыста:
Рабочы,
колгасьнік,
паэта.
У новыя гмахі
рамонты
Лета, як цынк,
пераліта.
Выходзіце адзіным
фронтам
на штурмы
сакрэта
літар!

30-VIII-31 г.
ст. Негарэлае.

Форсаваць тэмпы культурнай рэволюцыі

Задачы культурнай рэволюцыі не аддзельны ад агульных задач социялістычнай рэконструкцыі народнай гаспадаркі СССР. Адзін з рашаючых вучасткаў культурнай рэволюцыі— усеагульнае пачатковае навучаньне і ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дарослага насельніцтва. Бальшавіцкая падрыхтоўка да навучальнага году і пасьпяховае правядзеньне навучаньня зьяўляюцца важнейшай умовай для форсаванага вырашэньня задач культурнай рэволюцыі.

Сёньня мы ўступаем у новы 1931-32 навучальны год. Сёньня мы ўступаем у другі год барацьбы за суцэльна-пісьменную Беларусь, за політэхнічную школу.

Падрыхтоўка да навучальнага году і „Дня вучобы" па БССР, як сьведчаць факты, паданыя ў друку, факты, якія толькі пазаўчора высьветлены аб'яднаным рэйдам ударнікаў „Праўды", „Зьвязды" і „Савецкай Беларусі", некаторымі раёнамі і некаторымі цэнтральнымі організацыямі праводзілася нездавальняюча, з права-опортуністычным „халадком". У выніку—некаторыя раёны не пачынаюць сёньня, разам з усёй БССР, навучальны год.

Яшчэ і сёньня, калі ўсе школы, інтэрнаты і майстэрні для школ павінны быць гатовы, прыняць вучняў, мы маем раёны і сельсаветы, дзе рамонт школ ня скончаны, дзе не гатовы інтэрнаты, дзе няма майстэрняў.

Новы навучальны год трэцяга рашаючага і чацьвертага завяршаючага году пяцігодкі павінен праходзіць пад лёзунгам хутчэйшага правядзеньня сямігадовага абавязковага політэхнічнага навучаньня. падвышэньня якасьці работы ўсёй сыстэмы народнай адукацыі, пачынаючы ад раінспэктара, які павінен зьяўляцца інструктарам-мэтодыстым, організатарам і правадніком мэтодычнага кіраўніцтва ў раёне, і асабліва рэзкага падвышэньня якасьці масавай школы.

„Правядзеньне ўсеагульнага абавязковага першапачатковага навучаньня па ўсёй краіне, па ўсім Саюзе будзе найвялікшай перамогаю ня толькі на культурным, але і на політычным і гаспадарчым фронтах" (Сталін). Працоўныя БССР пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі зрабілі рашаючы крок у справе культурнай рэволюцыі. Цяпер трэба ісьці да новых перамог за сямігадовае ўсеагульнае абавязковае політэхнічнае навучаньне. За якасьць, за шырокае разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў школах і навучальных установах.

Комсамольскія, піонэрскія і школьныя організацыі павінны з першых-жа дзён вучобы дабіцца высокаякасных паказчыкаў у посьпехах вучняў, павінны будаваць сваю работу па-новаму ў адпаведнасьці з сучаснымі запатрабаваньнямі.

Тыя раёны, гарады і сельсаветы, якія сёньня ня могуць распачаць заняткі, павінны неадкладна, не чакаючы ні хвіліны, мобілізаваць усе сілы і сродкі, мобілізаваць усе магчымасьці, каб у бліжэйшыя-ж дні распачаць заняткі.

Савецкая Беларусь к 1-му мая 1932 году з суцэльна няпісьменнай краіны павінна стаць суцэльнапісьменнай.

Гэтую задачу мы павінны выканаць. і яна будзе выканана.

Заводы, дайце школам соцсумяшчальнікаў

Рабочыя ленінградзкага заводу „Сьцяг працы" высунуў ідэю соцыялістычнага сумяшчэньня ўдарнікаў заводаў школам.

Завод імя Кірава, а за ім і іншыя, горача падтрымалі прапанову рабочых заводу „Сьцяг працы". Завод імя Кірава вылучыў у школу трох соцыялістычных сумяшчальнікаў; два члены ІТС будуць працаваць; у якасьці намесьніка загадчыка школай і нам. загадчыка навучальнай часткай. Адзін рабочы-ударнік вылучан намесьнікам загадчыка вытворчай часткі падшэфнай школы. Організатарамі вытворчай практыкі ў школьных майстэрнях будуць 6 кваліфікаваных рабочых і інжынэрна-тэхнічны працаўнік.

У нас, у БССР, заводы шэфы школ яшчэ не падыйшлі шчыльна да пытаньня соцыялістычнага сумяшчэньня. У нас часьцяком складаюцца дагаворы паміж заводам і школай аб працы вучняў на вытворчасьці, і толькі. Ніводзін з заводаў у БССР яшчэ во ўсю шырыню ня ставіў перад сабою пытаньня аб соцсумяшчэньні. Ніводзін завод не прымацаваў сваіх спэцыялістых да падшэфнай школы.

Інжынэрна-тэхнічны пэрсонал заводаў і фабрык, дапамога якіх вельмі неабходна школам, яшчэ далёкі далёкі ад школ, далёкі ад актыўнага ўдзелу ў жыцьці падшэфнай школы.

Заводы, фабрыкі, МТС і колгасы павінны даць школам соцсумяшчальнікаў.

Нам вядома, што Ісэнбаеўская школа сваімі посьпехамі ў політэхнізацыі абавязана ў значнай меры актыўнаму ўдзелу рабочага і інжынэрна-тэхнічнага актыву заводу імя Кірава.

Неабходна, каб і ў нас, у БССР, рабочыя заводаў і інжынэрна-тэхнічны пэрсонал ня толькі цікавіліся ад выпадку да выпадку становішчам школы, але былі актыўнымі дапаможнікамі ў наладжваньні яе работы.

Неабходна, каб кожны завод паставіў перад сабою ва ўсю шырыню пытаньне аб соцыялістычных сумяшчальніках, абгаварыў шырока гэта пытаньне на масавых рабочых сходах, і тут-жа вылучыў соцсумяшчальнікаў, людзей, якія-б хацелі і маглі-б дапамагчы школе. Прыцягнуць рабочых-ударнікаў і спэцыялістых да адміністрацыйнага і мэтодычнага кіраўніцтва школ.

Неабходна, каб партыйна-комсамольскія, профэсыйныя і піонэрскія організацыі ўзяліся па-ўдарнаму за вылучэньне соцсумяшчальнікаў, за справу конкрэтнай дзелавой дапамогі школам у наладжваньні політэхнізацыі.

Р. П.

Створым адзіны плян комуністычнага выхаваньня падрастаючай зьмены

(Да ўсіх піонэраў і дзяцей працоўных, да ўсіх настаўнікаў, да ўсіх рабочых і колгасьнікаў БССР)

Юныя ленінцы!

Мы ўступаем у другі навучальны год пасьля ўвядзеньня ўсеагульнага навучаньня. Ваша задача—організаваць дзяцей працоўных на пасьпяховае правядзеньне навучальнага году.

Дабівайцеся поўнага ахопу ўсіх дзяцей школай. З большай нянавісьцю змагайцеся з усялякімі спробамі клясавага ворага пашкодзіць усеагульнаму навучаньню.

Дабівайцеся, каб начучаньне пачалося ў тэрмін.

Дамагайцеся забясьпечаньня дзяцей беднаты інтэрнатам, вопраткай, абуткам, гарачым сьнеданьнем, падручнікамі, сшыткамі. Патрабуйце, каб колгас наладзіў падвоз дзяцей у школу.

Організоўваючы дзяцей працоўных на гэту работу, уцягвайце іх у свае баявыя рады, у рады юных ленінцаў.

Дзеці працоўных!

Цэнтральнае бюро дзіцячай комуністычнай організацыі заклікае ўсіх вас організавана прыйсьці ў школу. Будзем настойліва змагацца за пасьпяховую вучобу, за найлепшае скарыстаньне кожнай навучальнай гадзіны.

Уладзімер Ільліч казаў: „Нельга сабе ўявіць ідэалу будучай грамады без злучэньня навучаньня з вытворчаю працай маладога пакаленьня".

Комсамол, пад кіраўніцтвам партыі, пры ўдзеле піонэраў дабіўся правядзеньня ў жыцьцё гэтага запавету Ільліча.

Мы ператвараем нашу школу ў політэхнічную, якая цесна зьвязвае навучаньне дзяцей з вытворчаю працаю на заводзе, у колгасе, саўгасе.

Піонэры, дзеці працоўных! Узмацніце свой удзел у барацьбе за політэхнічную школу. Патрабуйце прымацаваньня ўсіх школ да вытворчасьці. Дабівайцеся складаньня дагавароў між школаю і заводам, колгасам, саўгасам. Выносьце на абгаварэньне рабочых, колгасьнікаў навучальныя праграмы вашай школы.

Змагайцеся за поўнае ажыцьцяўленьне пастаноў партыі і ўраду аб політэхнізацыі школы. Зьнішчайце ўсе перашкоды клясавага ворагу на вашым шляху.

Таварышы настаўнікі!

Вы, атрымаўшыя ордэн Чырвонага Сьцягу, вы, якія непасрэдна стаіце на фронце комуністычнага выхаваньня падрастаючага пакаленьня, павінны быць першымі памочнікамі партыі і ўраду ў пасьпяховым правядзеньні ўсеагульнага навучаньня і політэхнізацыі школы.

Цэнтральнае бюро дзіцячай комуністычнай організацыі ад імя юных піонэраў і ўсіх дзяцей працоўных Савецкай Беларусі прад'яўляе вам соцыялістычны рахунак!

Ахапеце ўсіх дзяцей школаю, дапамажэце організаваць у школах гарачае сьнеданьне, дамагайцеся забясьпечаньня дзяцей беднаты вопраткай, абуткам, падручнікамі, сшыткамі. Дабівайцеся поўнага ажыцьцяўленьня ідэй політэхнізму, дабівайцеся, каб ідэі політэхнізму былі вядомы ўсім рабочым, усім колгасьнікам.

Гэты соцыялістычны рахунак трэба аплаціць у самы кароткі тэрмін.

Таварышы рабочыя, колгасьнікі!

ЦБ ДКО зьвяртаецца да вас з заклікам:

Штодзённа дапамагайце школе ў працы. Хутчэй зьнішчыце разрыў паміж школай і вытворчасьцю. Пашлеце сваіх лепшых таварышоў інструктарамі па вытворчай рабоце ў школе. Стварэце найлепшыя ўмовы для працы дзяцей на вашым заводзе, фабрыцы, у колгасе, саўгасе.

Прымайце ўдзел у абгаварэньні програмы навучаньня ў школе, давайце свае прапановы.

Таварышы рабочыя і колгасьнікі. І вы зьяўляецеся настаўнікамі падрастаючай зьмены. Вы павінны навучыць сваіх дзяцей рабоце на вытворчасьці, перадаць вопыт барацьбы за соцыялізм.

Створым адзіны плян комуністычнага выхаваньня падрастаючай зьмены

Таварышы рабочыя, колгасьнікі, настаўнікі, піонэры і ўсе дзеці працоўных!

15-га верасьня організуем Усебеларускі суботнік на карысьць усеагульнага навучаньня. У гэты суботнік адрамантуем абутак і вопратку для вучняў, адрамантуем памяшканьні школ, парты, навучальныя прылады. Прывязем у школу апал.

Пад кіраўніцтвам партыі ператворым Савецкі Саюз — бацькаўшчыну сусьветнага пролетарыяту—у краіну суцэльнай пісьменнасьці. Выкуем з падрастаючага пакаленьня сапраўдных змагароў, здольных канчаткова пабудаваць соцыялістычны сьвет.

ЦБ ДКО ЦК ЛКСМБ

У ПРАДМЮДАЎСКІМ МАРШЫ РАЎНЕНЬНЕ НА ПЕРАДАВЫХ

Акамсамоленымі заводамі, цэхамі, ударнымі брыгадамі сустракае МЮД комсамольскі Менск

Лепшы ўдарнік комсамолец Палякоў прадстаўлен да ўзнагароды ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА СЬЦЯГУ



К-ц ударнік т. Шульман перадаецца ў партыю да 17 МЮД'у. (Друкарня імя Сталіна)

Падрыхтоўку да XVII МЮД'у менская комсамолія адзначае новым уздымам ініцыятывы і энэргіі за выкананьне і перавыкананьне плянаў трэцяга рашаючага. У барацьбе за гэта менская комсамолія змагалася за павялічэньне сваіх радоў, за пертварэньне КСМ у шматмільённы.

За апошнія чатыры 5-цідзёнкі жніўня арганізацыя вырасла на 420 чал. XVII МЮД організацыя сустракае новымі ўдарнымі брыгадамі. Да МЮД'у адчыняецца „Дом навукі і тэхнікі"—гэта яшчэ адзін вялікі ўклад у гісторыю барацьбы комсамолу за соцыялізм. „Дом навукі і тэхнікі" дапаможа комсамольскім ячэйкам, паасобным комсамольцам і рабочай моладзі аўладаць вышынямі тэхнікі сваёй вытворчасьці.

Аднак, мы павінны адзначыць, што організацыя прыходзіць к XVII МЮД'у з прарывамі ў паасобных галінах работы. Ня гледзячы на значны рост організацыі, барацьба за рост у апошні час паслабла. Опортунізм і самацёк у паасобных колектывах усё яшчэ існуе. Таксама зусім дрэнна ідзе перадача ў партыю. Інтэрнацыянальная работа і вайсковая ўсё яшчэ слабыя зьвеньні ў рабоце менскай організацыі.

Яшчэ ня ўсе колектывы і ячэйкі конкрэтна ўзяліся за ажыцьцяўленьне 6 умоў Сталіна, на нарадзе гаспадарнікаў, якія павінны стаць програмай барацьбы кожнага колектыву і ячэйкі.

Задача організацыі ў тым, каб зараз-жа, з усёй адданасьцю і бальшавіцкай настойлівасьцю, ліквідаваць гэтыя прарывы. Новыя абставіны патрабуюць большых тэмпаў у павышэньні якасьці работы менскай комсамольскай організацыі.

10 вагонаў у падарунак 17-му

На „Полымя рэволюцыі" к 17 МЮД'у організаваны тры ўдарныя комсамольскія брыгады. Адна з іх, брыгада кацельшчыкаў, к 17 МЮД'у пераходзіць на гаспадарчы разрахунак,

Колектыў паставіў мэтай організаваць к 17 МЮД'у новыя ўдарныя брыгады сталяроў і сьлесароў у таварным і пасажырскім цэхах, і ня менш як па адной брыгадзе ў кожным цэху перавесьці на гаспадарчы разрахунак.—Брыгады зараз у стадыі організацыі. Комсамольская брыгада кацельшчыкаў за ліпень выканала грапфінплян на 113 проц. Брыгада аб'явіла бойку надбальству і неорганізаванасьці ў працы.

Брыгады таварнага цэху склалі дагавары з цэхадміністрацыяй і ўзялі павышаныя нормы выпрацоўкі.

У выніку добрай пастаноўкі працы, рамонтны цэх першым па заводзе акомсамолены на 100 проц.

Вось адзінкі з лепшых: Вілімовіч, брыгадзір брыгады сьлесароў Чарнецкі, кацельшчык Алесь Мілітовіч. Чарнецкі ўвесь час перавыконвае сваё заданьне да 17 МЮД'у ўступае ў рады ЛКСМБ.

Колектыў у падарунак МЮД'у выпускае звыш нормы дзесяць вагонаў імя „17 МЮД'у".

Сіліцкі

АБ ЗМАГАНЬНЯХ „ЧЫРВОНАЗЬМЕНАЎСКАЙ"

У лютым 1931 году на заводзе „Варашылава" працавала брыгада з 10 чалавек па зборцы цэнтравальных варштатаў. Брыгада мела нарады на работы, але ніхто з 10, акрамя брыгадзіра, ня ведаў аб іх.

У брыгадзе адсутнічала грамадзка-палітычная праца, панавалі прагулы, спазьненьні, брак.

У лютым выпусьцілі 7 варштатаў замест 25. Плян выканалі ўсяго на 28 проц.

Гэта ўзьняло на ногі ўсю грамадзкасьць заводу. Бюро колектыву ЛКСМБ паставіла перад брыгадай пытаньне рубам. Аб гэтым доўга гаварылі на сходах, аб гэтым нямала пісала заводзкая шматтыражка. На сходзе брыгады члены яе абавязаліся быць першымі на штурме прарыву. Пачалі працаваць у выхадныя дні. Працавалі на паўтарыдзьве зьмены. Працавалі добрахвотна, зьнішчылі прагулы і спазьненьні, узьнялі дысцыпліну. У выніку—лютаўскі прарыў ліквідавалі, а за сакавік выканалі промфінплян на 100 проц.

Ініцыятыва брыгады расла. У брыгадзе зьявілася думка організаваць вытворча-бытавую комуну. У адзнаку дзесяцігадовага юбілею „Чырвонай Зьмены", комуну назвалі „Чырвоназьменаўскай".

Брыгада дала 13 рацыяналізатарскіх прапаноў. Сярод членаў брыгады разьвіваецца індывідуальнае соцспаборніцтва. У адзнаку 17 МЮД'у комуна пераведзена на гаспадарчы разрахунак, як паўнейшую форму соцспаборніцтва. За першае паўгодзьдзе комуна дала 143,2 проц. выкананьня вытворчага пляну. Комуна, першай на заводзе, перайшла на прэміяльна-прогрэсыўную зьдзельшчыну. Тут узорна працуюць плянава-опэрацыйныя групы.

Колектыў ЛКСМБ, для перадачы вопыту працы плянава-опэрацыйных груп Чырвоназьменаўскай комуны, склаў добраахвотную ўдарную брыгаду. У перадачы вопыту комуны добры ўдзел прымае заводзкая шматтыражка.

Вопыт плянава-опэрацыйных груп „Чырвоназьменаўскай" брыгады патрэбна вынесьці на старонкі нашых газэт, зрабіць набыткам усяе комсамольскае організацыі Беларусі.

В. Кавалевіч

Колгасныя ячэйкі напярэдадні МЮД'у

Комсамольская ячэйка колгасу імя Крупскай, Менскага прыгараднага сельсавету, першая аб'явіла сябе ўдарнаю брыгадай па сваячасовай уборцы ўраджаю ў колгасе. Уборка закончана датэрмінова.

У саўгасе цэнтральнай садова агароднай базы комсамольцы ўзялі шэфства над датэрміновым засіласаваньнем траншэй. Скарыстоўвалі свае выхадныя дні, прыцягвалі на дапамогу беспартыйную моладзь колгасу. Урэшце ўсе траншэі і башты забіты поўнасьцю. Тут-жа, на затрамбоўцы сілосу, ячэйка праводзіць работу з беспартыйнай моладзьдзю па ўцягненьню яе ў комсамол. Рост ячэйкі значна ўзьняўся. Другі факт: ячэйка колгасу „Першая конная", Новадворскага сельсавету, добра наладзіла працу па росту. Два разы праведзены сходы з беспартыйнай моладзьдзю. У Самахвалавіцкім сельсавеце організавалі брыгады імя 17 МЮД'у па сваячасовай уборцы ўраджаю. А паасобныя ячэйкі сельсавету склалі ўмовы на лепшую падрыхтоўку к МЮД'у, выдзелілі брыгады ў слабейшыя ячэйкі, узяўшы іх на комсамольскі буксір.

Комсамольскія колектывы гораду ў поўнай меры павінны адказваць за работу колгасных і вясковых ячэек. Аднак, буйнейшыя колектывы Менску (Варашылава, Белдзяржбуд, „Бальшавік") нічога не зрабілі, каб перанесьці свой вопыт у галіне організацыі соцыялістычнай працы ў колгасныя ячэйкі. К.

„Бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай" (Сталін)

К МЮД'у—Дом навукі і тэхнікі

17 МЮД менская комсамолія адзначае адчыненьнем „Дому навукі і тэхнікі".

Дом навукі і тэхнікі ставіць сваёй мэтай узброіць комсамолію і рабочую моладзь ведамі і дапамагчы ячэйкам, колектывам і паасобным комсамольцам аўладаць тэхнікай, каб практычна рэалізаваць задачы тэхнікі на сваім прадпрыемстве.

Дом навукі і тэхнікі павінен стаць штабам усёй комсамоліі і рабочай моладзі па аўладаньню вышынямі навукі і тэхнікі соцыялістычнага будаўніцтва.



Ударная комсамольская брыгада друкарні імя Сталіна прэміруецца да 17 МЮД'у

Навічкі к МЮД'у

Завод „Комунар" да 17 МЮД'у прыходзіць у асноўным акомсамоленым. Роля комсамолу на вытворчасьці значна ўзьнялася. Раней недысцыплінаваныя і ня выконваючыя прамфінпляну навічкі зараз паказваюць узоры ўдарных тэмпаў у рабоце.

Комсамолец навічок Васілёнак быў пасланы на лесанарыхтоўкі. Ударнаю працай ён паставіў рэкорд, нарыхтаваўшы 200 вагонаў дроў. Брыгада бляшанага цэху спыніла сваю работу з-за недахопу заклёпкі. Прамфінпляну пагражаў зрыў. Навічок Гурэвіч на самаробным варштаце выпрацаваў 4000 заклёпак і гэтым вывеў брыгаду з прарыву.

У паасобных цэхах навічкі ўсё-ж яшчэ ня ўцягнуты ў комсамольскія работы. Колектыў „Комунара" абавязан да 17 МЮД'у ліквідаваць гэты надахоп. К.

Комсамолец--майстар

У маленькіх раскіданых майстэрнях (цяпер „Комунара") гарачым ключом білася жыцьцё. Смуглаватыя, умазаныя маслам працавалі у майстэрнях у невялікай колькасьці рабочыя. Што дзень яны ўпарта змагаліся за складаньне, за пертварэньне майстэрань у завод.

Сюды малапісьменным пятнаццацігадовым юнаком у 1924 годзе прышоў Палякоў. „Парнішка" так яго звалі рабочыя. Ён быў сухі чарнаваты падобны да цыгана. Тут ён атрымаў сваю загартоўку.

Не шкадуючы сіл і энэргіі, ён аддаўся цалкам заводу. Днямі, начамі Палякоў вывучаў кожную дэталь, кожны кавалачак сталі.

У вялікім будаўніцтве комсамол высунуў ідэю соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Па ўсёй краіне пранеслася хваляй гэта ідэя. Першым на „Комунары" ў барацьбу за гэту ідэю пашоў комсамольскі колектыў: ў першых радох быў Палякоў. У гэты час, у гэтыя дні ён неяк асабліва квітнеў, гарэў на рабоце, а вочы ўсьміхаліся. Гэта былі самыя лепшыя дні ў жыцьці Палякова, дні праверкі сваіх сіл. У гэты час яго высоўваюць на адказную работу кіраўніком вытворчай нарады і вытворчага сэктару. Вытворчы сэктар зрабіўся магнэсам, які прыцягваў усю рабочую масу. Комсамольцы ў цэху былі лепшымі ўдарнікамі і прыкладам у рабоце. Аўторытэт іх рос штодня, разам з гэтым рос і аўторытэт Палякова.

Рабочыя паважаюць Палякова. Бязмежнай адданасьцю вытворчасьці, умелай пастаноўкаю і організацыяй работы заваяваў ён гэта. Па ўсіх цэхах на сходах рабочых комсамольцы бязьлітасна кляймуюць ганьбаю рвачоў, ілжэударнікаў, вылучаючы за прыклад і перамогі лепшых рабочых.

Завод штодзень рос і ўзмацняўся, пертвараючыся ў буйнае прадпрыемства соцыялістычнай прамысловасьці. Узводзіліся новыя цэхі з новымі машынамі. Жыцьцё пульсавала радасьцю соцбудаўніцтва. Цяпер патрэбны новыя людзі, новыя кадры, ня толькі адданыя справе, але і тэхнічна падрыхтаваныя. Па заводзе ідзе вылучэньня ўдарнікаў на тэхкурсы. Каго-ж пасылаць? Вядома комсамольцаў. Лепшы ўдарнік, адданейшы справе, неадлучны ад заводу, аўторытэтны сярод усіх рабочых, Палякоў едзе на курсы з таварышамі.



Тав. Палякоў.

Была хлюпкая нудная восень. У цэх увайшоў худаваты, тонкі, нізкага росту хлопец. Твар яго выглядаў сур'ёзна Хутка аглядзеўшы усе куткі і варштаты, падышоў да мабыць, знаёмага рабочага. Радасна прывітаўся, крыху пагутарыў аб становішчы цэху. Затым так-жа ціха і ўпэўнена выйшаў.

У цэху за апошні час прыбылі новыя рабочыя. Яны ня ведалі Палякова

— Хто гэта?—запытаў адзін рабочы. А гэта наш новы майстар—адказаў з гордасьцю стары рабочы.—Майстар?.. Майстар цэху!?.—недаверліва паківалі галавою некалькі рабочых. Што гэта за майстар!

Зусім інакш сустрэлі Палякова старыя рабочыя, партыйны і комсамольскі колектыў. Тут ён быў абкружаны ўвагай і штодзённай дапамогай.

Праз некаторы час Палякоў ужо ў цэху за працай. Цяпер Палякоў ужо ня проста ўдарнік, а комсамолец-ударнік,-майстар самага важнейшага цэху, сэрца і нэрваў заводу—сьлясарна мэханічнага.

Ударны квартал...Экзамен для ўсіх рабочых заводу і ў першую чаргу для яго камандзіраў.

Ударны квартал...

Партыйцы, комсамольцы, увесь рабочы колектыў па ўдарнаму змагаюцца за ударны.

Палякоў з усёй сілай, энэргіяй, адначасова спакойнасьцю і бальшавіцкай упартасьцю разам з імі перабудоўвае работу, расстаўляе сілы ў цэху, і сваячасова па опэрацыйнаму хутка спраўляе хворыя месцы,—умела адчыняе новыя хады для посьпехаў.

Студзень, люты. Цэх Палякова не здае позыцый, замацоўвае ўдарныя тэмпы і посьпехі. Цэх ідзе усё ўперад, у авангардзе заводу.

Малады комсамолец Палякоў, той, што прышоў на завод 15-гадовым няпісьменным юнаком, зараз—член партыі і прыкладны кіраўнік важнейшага вытворчага вучастку „Комунара".

Комсамольскі колектыў узьняў пытаньне перад заўкомам аб хадайніцтве перад ЦВК БССР аб узнагародзе Палякова, як лепшага ўдарніка, як першага ініцыятара соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва на заводзе, ордэнам працоўнага сьцягу. Заўком, сходы рабочых „комунараўцаў" падтрымалі ініцыятыву комсамольскага колектыву і хадайнічаюць перад ЦВК БССР аб узнагародзе Палякова к вялікаму дню—17 МЮД'у—ордэнам працоўнага сьцягу.

Палякоў—не адзін, такіх ужо тысячы.

Г. Фіялкін.

У падарунак МЮД'у

Комсамолія „Комунара" ў падарунак МЮД'у організавала вячэрнюю школу-комбінат, якая ставіць сваёй мэтай даць сярэдня-політычныя, агульна-адукацыйныя і тэхнічныя веды. Школа разьлічана на тры гады навучаньня. Скончыўшыя школу атрымліваюць кваліфікацыю ня ніжэй 5 разраду.

Зараз пастаўлена задача ахапіць усю рабочую моладзь гэтай школай, асабліва новых робочых. Колектыў правёў па ўсіх цэхах сходы па гэтаму пытаньню. Прайшлі іспыты ўжо 311 чалавек.

Ініцыятыва комсамольскага колектыву аб організацыі школы-комбінату ўхвалена партыйным колектывам і рабочымі заводу. Ужо зараз няма ніводнага комсамольца і маладога рабочага, неахопленага якой-небудзь формай вучобы.

Комсамольскі колектыў „Комунара" адчыняе агульнажыцьцё да 40 чалавек рабочай моладзі імя XVII МЮД.

Усю барацьбу і падрыхтоўку к МЮД'у комунараўцы праводзяць пад знакам барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Грышка.

У бой за паперу

Барацьба за паперу—справа ўсёй грамадзкасьці

Каб забясьпечыць бесьперапынную працу папяровых фабрык, барацьбу за папяровую макулатуру, мы павінны паставіць баявою задачаю дня.

Ня гледзячы на неаднакратныя дырэктывы комсамольскіх і партыйных органаў, гэта работа не знайшла сабе конкрэтнага праламленьня.

Створаны пры рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“ штаб па збору папяровай макулатуры і барацьбе за бесьперапынную працу папяровых фабрык выпрацаваў плян дзейнасьці, па якому неабходна мобілізацыя ўвагі ўсіх працоўных на разгортваньне гэтай работы.

Згодна выпрацаванаму пляну, усе раённыя камітэты комсамолу павінны зараз-жа арганізаваць пры сабе раённыя штабы па кіраўніцтву гэтай работай.

Плян працы штабу павінен быць абгавораны ва ўсіх раённых камітэтах і колектывах з тым, каб пасьля гэтага былі вызначаны конкрэтныя шляхі ўдзелу організацыі ў рэалізацыі намечаных мерапрыемстваў.

З пляну ўсебеларускага штабу па збору макулатуры і рызьзя пры рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“

1. Організаваць у былых акруговых гарадох штабы пры райкомах ЛКСМБ. Працу скончыць не пазьней 5-га верасьня, аб чым не пазьней 5-га паведаміць штаб (склад штабу і адказны за гэтую работу).

2. У раённых цэнтрах стварыць ячэйкі садзейнічаньня пры райкомах комсамолу. Работу скончыць не пазьней 8-га верасьня.

3. У буйных вытворчых цэнтрах стварыць ячэйкі пры комсамольскіх колектывах, на прадпрыемствах, ва ўстановах і ЖАКТах. Работу скончыць не пазьней 15-га верасьня.

4. Не пазьней 20-га верасьня штабы склікаюць конфэрэнцыі ўсіх ячэек садзейнічаньня для зацьверджаньня пляну работы.

Масавая работа

1. Організаваць асьвятленьне гэтай работы ў друку (як цэнтральным, так і раённым, а таксама адзін раз у тыдзень зьмяшчаць кіруючы матар'ял.

2. Раённыя ячэйкі садзейнічаньня на працягу верасьня месяца праводзяць выезды ў колгасы і саўгасы з мэтай організацыі колгасных зборшчыкаў па збору ўтылю.

3. Раённыя ячэйкі садзейнічаньня сумесна з ячэйкамі сельсаветаў на працягу верасьня месяца організоўваць брыгады па збору ўтылю ва ўсіх раённых і вясковых школах для працы на працягу ўсяго году.

Оргработа

1. Да 15-га верасьня організаваць інстытуты прыбіральшчыц, дваравых працаўнікоў, усклаўшых на апошніх збор утылю па мясцох іх работы. Не пазьней 25-га верасьня склікаць нараду апошніх.

2. На працягу верасьня правесьці падрыхтоўчую кампанію па ўсіх школах з мэтай організаваць сыстэматычны збор утылю па школах на працягу ўсяго навучальнага году. З 1-га па 15-га верасьня правесьці прымацаваньне піонэр-атрадаў да адпаведных вучасткаў гораду.

3. На працягу верасьня-сьнежня месяцаў організаваць ня менш 10 масавых паходаў па збору ўтылю. Не пазьней 15-га верасьня правесьці першы ўсебеларускі масавы збор утылю ў карысьць грамадзянскай авіяцыі.

4. Пры ўсебеларускім штабе правесьці адну ўсебеларускую ўтыль-лётарэю, білеты на якую прадаваць за ўтыль.

5. Правесьці прэміяваньне ўсебеларускім штабам лепшых колгасных брыгад, школ, піонэр-атрадаў, інстытутаў уборшчыц, дворнікаў і ячэек садзейнічаньня; устанавіць пераходны сьцяг для лепшай ячэйкі.

6. За час існаваньня штабу організаваць ня менш 10 паказальных комсамольскіх загатоўчых пунктаў па нарыхтоўцы ўтылю ў раёнах, і па два пункты ў былых акруговых цэнтрах.

Хваляй чырвоных абозаў сустрэнем сямнаццаты МЮД

Організацыяй мюдаўскіх абозаў і ўздымам комсамольскага энтузіязму адкажам на пастанову ЦК ЛКСМБ

Пераважная большасьць комсамольскіх організацый у хлебазагатоўчай кампаніі ўдзельнічае зусім слаба; ня ўключылася яшчэ ва ўпартую барацьбу за выкананьне пляну хлебазагатовак, за сканчэньне хлебазагатоўчай кампаніі датэрмінова.

Усе комсамольскія організацыі павінны зараз-жа ўзмацніць працу па хлебазагатоўках і сёньня-ж распачаць падрыхтоўку да організацыі мюдаўскіх чырвоных абозаў хлеба, правільна раставіўшы свае сілы на рашаючых вучастках хлебазагатоўчай кампаніі, каб сустрэць 17 МЮД магутным усебеларускім чырвоным абозам.

Пастанова

Сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 28-VIII-31 г, аб організацыі ўсебеларускага чырвонага абозу прысьвечанага 17 МЮД'у

У азнаймаваньне 17 МЮД'у організаваць чырвоны ўсебеларускі хлебны абоз па здачы дзяржаве збожжа, ільнавалакна, насеньня бульбы і агароднiны.

2. Прапанаваць РК КСМ і ячэйкам разгарнуць шырока масавую работу па мобілізацыі саўгаснай, колгаснай і аднаасобнай бядняцка-серадняцкай гаспадаркі на ўзмацненьне тэмпаў хлебанарыхтоўчай кампаніі, організаваўшы ўдарныя брыгады ў саўгасах, колгасах па абмалоту збожжа, дабіўшыся колектыўнай апрацоўкі збожжа ў аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.

3. Організацыя мюдаўскага абозу павінна быць баявой праверкай падрыхтоўкі КСМ ор-цыі да правядзеньня хлебанарыхтоўчай кампаніі лепшая організацыя і раставоўка комсамольскіх сіл на рашаючых вучастках хлебанарыхтоўчай кампаніі (прыёмачныя пункты, элеватары і інш.).

4. Даручыць тав. Сапега дагаварыцца з Наркамснабам і Хлебжывкааперацыяй аб дачы адпаведных указаньняў па іх сыстэме.

5. Аб ходзе організацыі мюдаўскага чырвонага абозу матар'ял своечасова дасылаць у „Чырвоную Зьмену“.

Вынікі правядзеньня гэтай работы даслаць у ЦК КСМ не пазьней 10-IX-31 г.

Жнівеньскі плян хлебанарыхтовак перавыкананы

Аршанскі раён свой плян па хлебанарыхтоўках за жнівень месяц ужо перавыканаў. На 27-е жніўня нарыхтавана 220 тон, замест 180 тон па пляну. Чырвоныя абозы працягваюць штодзённа прыбываць.

Дзякуючы значнаму ўздыму колгасных і бядняцка-серадняцкіх мас, якія, непасрэдна пасьля абмалоту, чырвонымі абозамі здаюць лішкі збожжа дзяржаве, у канцы жніўня амаль закончваецца ўвесь верасьнёўскі плян хлебанарыхтовак.

Цэлы рад сельсаветаў высоўваюць сустрэчныя лічбы збожжа і бульбазагатовак, павялічваючы кантрольныя лічбы на 20-25-30 проц.

Посьпехі колгасу „Шлях колектывізацыі“—усім колгасам

Колгасы Івана-Агароднiцкага сельсавету, Слуцкага р-ну, на аснове зьдзельшчыны, ударніцтва і соцспаборніцтва і правільнага ўліку працы дабіліся вялікіх посьпехаў ва ўборцы збожжа, і зараз-жа пасьля ўборкі прыступілі да абмалоту і здачы яго дзяржаве.

У азнаку закончэньня суцэльнай колектывізацыі ў Івана-Агародніцкім с-с, організавалі чырвоны абоз і здалі дзяржаве 1500 пудоў збожжа.

Колгас „Шлях колектывізацыі“ кантрольнае заданьне па здачы дзяржаве хлеба ўжо перавыканаў: да 20-жніўня здаў 927 пудоў.

Колгасы Івана-Агародніцкага с-с абавязаліся ў парадку соцспаборніцтва і ўдарніцтва вызначаныя кантрольныя лічбы здачы збожжа дзяржаве перавыканаць.

Новік Я.

Аднаасобніка—у рады перадавых

За лічбу 0,6 проц. у адказе комсамольцы Вушачаў і Лёзны

ячэйка колгасу павінна быць організатарам падпіскі ў аднаасобным двары

100 проц. ахоп працоўных пазыкай патрабуе яшчэ большага разгортваньня працы ў адстаючым аднаасобным сэктары.

Выходзячы з таго, што пазыка пасьпяхова рэалізавана ў горадзе і у значнай частцы колгасаў, асноўная частка выкананьня лёзунгу 100 проц. ахопу працоўных пазыкай павінна ісьці па лініі разгортваньня працы ў аднаасобным сэктары.

Комсамольскія ячэйкі павінны быць організатарамі масавых мерапрыемстваў: паходаў комсамольскіх брыгад з прыцягненьнем беспартыйнай працоўнай моладзі па вёсках, і інш.

Вушацкую і Лёзьненскую райорганізацыі мы заносім на шчыт чарапахі. Чакаем ад кожнай ячэйкі гэтых раёнаў практычных мерапрыемстваў.

Заносім на ганебны шчыт чарапахі



У хвасьце

1. Анікаўская комсамольская ячэйка Маслакоўскага сельсавету (Горацкага р-ну) на агульным сходзе ўхваліла, каб кожны комсамолец падпісаўся на пазыку на 30 р. Дагэтуль пастанова ня выканана.

М. Д.

2. Заданьне на рэалізацыю пазыкі па Валасавіцкім сельсавеце складае 13640 р. Дагэтуль пазыка рэалізавана толькі на 790 р.

Комсамольская ячэйка нічога практычнага ня робіць для разгортваньня падпіскі.

В. А.

* У комуне „Чырвоная Паляна“, Дубровенскага р-ну, падпіскай ахоплены ўсе комунары.

Наумаў.

Прыклад організаванай барацьбы

У Горбаўскім с-с, Лёзьненскага р-ну, падпіска на пазыку праходзіць надзвычайна дрэнна. Комсамольскі колектыў сельсавету абвясьціў штурмавы дэкаднік ліквідацыі прарыву ў падпісцы. На час дэкадніку ўвесь колектыў у 87 комсамольцаў разьбіты на брыгады, кожная брыгада прымацавана да пэўнай вёскі.

Уперадзе ідзе ячэйка колгасу „Інтэрнацыянал“, дзе пазыка рэалізавана на 3330 рублёў.

У ходзе падпіскі па сельсавеце ўжо адчуваецца праца комсамольцаў.

М. Гузоўскі.

* Ладіцкая ячэйка ЛКСМБ, Асіповіцкага р-ну, падпісалася колектыўна на облігацыю ў 100 рублёў. Індывідуальна ўсе комсамольцы падпісаліся на 100 проц. заработак. Выклікаем Ясенскую местачковую ячэйку на спаборніцтва.

Палявікоў.

Пакажам перадавікоў

Падпіска па аднаасобным сэктары адстае. Ёсьць раёны, сельсаветы, якія з посьпехам праводзяць гэтую працу: Бялыніцкі—98 проц, Лагойскі—77 проц., Капыльскі—161 проц. рэалізацыі кантрольных лічбаў па аднаасобным сэктары.

Юнкоры! Пакажы перадавікоў падпіскі. Пакажы, як яны дамагаюцца перамогі.

Да 17 МЮД'у даць 2000

За опортуністычныя адносіны да мобілізацыі комсамольцаў на торпзаводы Лёзьненскаму і Пухавіцкаму РК КСМ абвешчана суровая вымова

Пастанова Сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ яшчэ раз падкрэсьлівае неабходнасьць хутчэйшай мобілізацыі 2000 комсамольцаў да XVII МЮД'у на торпараспрацоўкі і ўмацаваньня комсамольскага ядра ў руднях „тарпянога Донбасу“.

Аднак, Горацкі райком комсамолу гэтую адказную гаспадарча-палітычную задачу здаў у палон самацёку.

Раённыя камітэты комсамолу да 17 МЮД'у павінны прыйсьці з рапартам выкананьня дырэктывы партыі і комсамолу аб мобілізацыі 2000 комсамольцаў на торпараспрацоўкі.

Мобілізацыя ідзе самацёкам

ГОРКІ. Мобілізацыя комсамольцаў на торпараспрацоўкі ідзе самацёкам. Райком ня ведае колькі яму неабходна мобілізаваць, згодна вызначанай разьвёрсткі ЦК, не вядзе вучоту мобілізаваных комсамольцаў і ня прымае захадаў да комсамольцаў, якія дэзэртавалі з торпзаводу.

Комсамольскія ячэйкі не атрымалі ўказаньняў ад райкому па гэтаму пытаньню. Для іх ня вызначаны кантрольныя лічбы па мобілізацыі. Адсутнічае гаспадарча-палітычная растлумачальная праца аб значэньні пераўтварэньня Беларусі ў „Тарпяны Донбас“ і, на гэтай падставе, аб неабходнасьці праводзіць мобілізацыю комсамольцаў на торпзаводы. Мобілізаваныя Горацкім райкомам комсамольцы па гэтай прычыне дэзэртуюць з торпзаводаў.

К 17 МЮД'у Горацкі райком комсамолу павінен рапартаваць аб закончэньні мобілізацыі комсамольцаў на торпзаводы.

А. Шаўцоў.

Даць 2000 да XVII МЮД'у

(З пастановы Сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ зд 23-VIII—31 г.).

Прыняць да ведама заяву тав. Быхаўскага аб тым, што Гомельскі, Лепельскі, Мазырскі, Талочынскі РК выканалі разьвёрстку па мобілізацыі другой тысячы на торпзаводы. Побач з гэтым, рад райкамолаў не выканалі сваёй разьвёрсткі (Крупкі, Жлобін Менск, Буда-Кашалёва, Уваравічы, Ветка, Клімавічы, Віцебск, Мсьціслаўль, Бабруйск); зусім ня выканалі разьвёрсткі Лёзна, Пухавічы.

Сэкратарыят пастанаўляе:

1. За опортуністычныя адносіны да мобілізацыі комсамольцаў на торпзаводы, абвясьціць суровую вымову бюро РК Лёзьненскага і Пухавіцкага раёнаў.

2. Устанавіць апошні тэрмін сканчэньня мобілізацыі другой тысячы комсамольцаў на торпзаводы да 17-га МЮД'у.

3. Зьвярнуць увагу ўсіх РК КСМ на забясьпечаньне якасьці мобілізуемых комсамольцаў на торпзаводы. Няпрыгодных адаслаць назад за рахунак РК.

4. Абавязаць тав. Быхаўскага разам з Белторпам, пасьля тэрміну сканчэньня мобілізацыі, далажыць Сэкратарыяту ЦК аб выкананьні, аб чым прадставіць дакладную запіску.

47 не заменіць 60

Пастанова кантрольнага пленуму комсамолу аб закончэньні мобілізацыі комсамольцаў на торпараспрацоўкі, з ліку 2000, да 25 ліпеня Бабруйскім райкомам ня выканана. Бабруйскі райком мобілізаваў 47 ч. замест вызначаных па разьвёрстцы ЦК 60. Далейшы стан працы не забясьпечвае выкананьня разьвёрсткі. Патрэбен пералом.

Буда-Кашалёўскі райком комсамолу, усьвядоміўшы палітычную важнасьць замацаваньня комсамольскага ядра на торпараспрацоўках, сваю разьвёрстку перавыканаў. Замест 10 комсамольцаў, мобілізаваў 15.

Аднак, райком ня прыняў належных захадаў да замацаваньня іх на сталай працы за торпзаводамі. Большасьць з мобілізаваных комсамольцаў Буда-Кашалёўскага раёну, дэзэртавала. Раённаму камітэту неабходна да 17 МЮД'у зьвярнуць дэзэртыраў на торп.

Ветрым.

ЯНЫ ТАРМОЗЯЦЬ НАВУЧАЛЬНЫ

Зараз-жа падцягнуцца. Ліквідаваць прарывы і пачаць заняткі

Таварыш Стром, а дзе будзе школа?

У 1930 годзе, па пастанове ВСНГ, у м. Сьмілавічы была адчынена профтэхшкола мэталістых паніжанага тыпу, якая на працягу навучальнага году ня мела сваіх будынкаў ні для акадэмпрацы, ні для майстэрань. Цэхі былі адчынены ў падвале, дзе ня толькі немагчыма было працаваць і набываць адпаведную кваліфікацыю, але нават і зайсьці жуласна, мільгаць, немень, цеснага. На 9. кв. мэтрах працавалі 65 чал. Шмат вучняў захварэла і прымушана было кінуць школу. На 65 вучняў адпушчана было агульнае памяшканьне, якое магло ўмясьціць максымум 20 чал. Дровы хоць і былі адпушчаны РВК, але з за галавацяпства мястэчковага савету і цягатуль ня вывезены. Дровы гнілі, прападалі, а вучні мёрзьлі.

У 1931 годзе школа была перададзена Белсампрамсаюзу, на што адпушчаны сродкі. Здавалася, толькі працуй і рыхтуй кадры. Профшколу рэарганізавалі ў ФЗВ і далі загад набраць 80 чал. Набор правялі, і адразу-ж паўстала пытаньне аб будынках, хоць і ставілася яно на працягу ўсяго навучальнага 1930—31 году.

Прэзыдыум мессавету рашыў для школы адпусьціць тры будынкі, у якіх пачаць нормальна працу.

На другі дзень старшыня мессавету тав. Крупкін, адчуваючы сябе поўным гаспадаром мястэчка і не зьвяртаючы ўвагі ні на якія пастановы, адміністрацыйна ўсяляе ў будынак, аддавы пад агульнае памяшканьне ШКМ, сваіх „бліжніх". У другім будынку, што аддавы пад ФЗВ, жывуць былы старшыня РВК тав. Шэлег і сакратар РК КП(б) тав. Стром, Крупкін і кажа: „Там жывуць, ведаеш хто?—Шэлег і Стром, а таму я вам будынак не аддам". А Шэлег сказаў: „Усёроўна з гэтага нічога ня выйдзе, будынкаў не палучыце".

Да пачатку навучальнага году засталося толькі 2 дні. Вынікаў да гэтага часу няма. раён таксама маўчыць, лічачы, што гэта не яго справа.

Вока.

Опортуністыя Кардзунаўскага с-савету зацягнулі навучальны год

У Кардзунаўскім сельсавеце Пухавіцкага р-ну да навучальнага году рыхтуюцца вельмі марудна. Яшчэ не ва ўсіх школах праведзен вучот дзяцей, якія павінны сёлета пайсьці ў школы.

Навучальны год па радзе вёсак (Старына, Шасьціполы, Дукорцічына) пад рэальнай пагрозай зрыву, бо няма памяшканьняў.

РВК і сельсаветы добра ведаюць аб гэтым, але не клапоцяцца перабудаваць у школы кулацкія хаты, якіх у раёне шмат.

Настаўнікі таксама мала зацікаўлены ў падрыхтоўцы да навучальнага году.

Трэба прыняць тэрміновыя захады для ліквідацыі прарываў у падрыхтоўчай рабоце і хутчэй пачаць заняткі.

Вішневы.

„Дабівайцеся самі"

Організацыя добрай студэнцкай практыкі, як частка падрыхтоўкі да навучальнага году, забясьпечвае посьпех у навучаньні. Але студэнцкая практыка ў Менскім індустрыяльна-пэдагогічным тэхнікуме наладжана з рук вон дрэнна.

20-га жніўня трэці курс тэхнікуму павінен быў пачаць практыку. Справа была не падрыхтавана і прыступілі да практыкі толькі 24 чал. Калі вучні зьвярталіся да дырэктара Паўловіча за накіраваньнем на практыку, ён адказваў:

— Ідзеце, бярэце самі і працуйце.

Вучням самім прышлося прыстасоўвацца.

На „ДА" студэнты цягаюць дошкі—вось і ўся практыка. К варштатам студэнтаў не дапускаюць.

Хутка павінны прыйсьці 150 новых студэнтаў 1-га курсу, для іх сустрэчы таксама нічога не падрыхтавана.

Партыйнаму і комсамольскаму колектывам Менскага індустрыяльнага пэдтэхнікуму неабходна тэрмінова заняцца пытаньнем практыкі студэнтаў і падрыхтоўкаю сустрэчы навічкоў.

Трэба прыцягнуць дырэктара Паўловіча да адказнасьці за абыякія адносіны да студэнцкай практыкі.

Валкін
Хітрук
Хутарэцкі



— Усе пачынаюць сёньня заняткі, а мы ня можам. Школы не пабудаваны

Пролетарыят Польшчы

пашырае фронт рэволюцыйнага змаганьня

Пад аховаю жандармэрыі, прадпрыемцы ўзмацняюць рабаўнічы наступ на працоўных

Сутычкі бастуючых з адміністрацыяй і паліцыяй

ВАРШАВА, 31. З прычыны ўсё большага пагаршэньня становішча рабочых, забастоўкі набываюць усё больш пашыраны і бурны характар. На панчошнай прамысловасьці ў Лодзі ўжо больш тыдня бастуе некалькі сот рабочых. Рабочыя настойліва дамагаюцца палепшаньня ўмоў працы. Забастоўка праходзіць надта бурна. Часта адбываюцца сутычкі з фабрычнай адміністрацыяй і паліцыяй.

Масавыя арышты сярод рабочых

ВАРШАВА, 31. Хваля забастовак пашыраецца на ўсёй Польшчы. Як паведамляе фашысцкі друк, у Варшаве бастуюць рабочыя на некалькіх фабрыках. На галоўнай трыкатажнай фабрыцы Гіршмана ўсе 2000 рабочых ахоплены забастоўкай. Рабочыя высоўваюць патрабаваньні павысіць зарплату і палепшыць іншыя ўмовы працы. З прычыны забастоўкі, фабрыка ачэплена двума моцнымі атрадамі паліцыі. Праводзяцца масавыя арышты сярод рабочых.

Польскі фашызм узмацняе пацыфікацыю Зах. Беларусі

ВІЛЬНЯ, 31. Польскі фашызм з мэтай пацыфікацыі працягвае высылку рэволюцыйных рабочых і сялян з прымежнай тэрыторыі Заходняй Беларусі. Як паведамляе фашысцкая прэса, кожны месяц з Вільні сыстэматычна высылаюцца па некалькі асоб. Апошні высяленьня заняўся гарадзкі стараста. За адзін толькі жнівень месяц з Вільні высланы 15 асоб, якім прад'яўлена абвінавачаньне ў комуністычнай дзейнасьці. Высланыя накіраваны ў Пазнанскае і Памерскае ваяводзтвы.

Забастоўка мэталістых у Верхняй Сілезіі

ВАРШАВА, 31. Як паведамляе соцыял-фашысцкі „Работнік", у Верхняй Сілезіі забаставалі рабочыя двух мэталічных заводаў „Побу" і „Сальва". Бастуе чатыры тысячы чалавек. Рабочыя настойліва дамагаюцца падвышэньня зарплаты і палепшаньня іншых умоў працы. 28-га жніўня адбылася дэманстрацыя бастуючых, якая прыняла бурны характар.

Новыя зачыненьні фабрык і звальненьні рабочых

ВАРШАВА, 31. У выніку паглыбленьня экономічнага крызысу ў Польшчы зачыняюцца новыя і новыя прадпрыемствы і павялічваецца беспрацоўе. Закрыцьцё фабрык і заводаў зьява частая. Як паведамляе соцыял-фашысцкі „Работнік", у Згежы зачынілася найвялікшая ў Польшчы фірма кажухоў і паліто. У Лодзі абанкруцілася фабрыка фарбы. У Тарноўскіх Горах зачынілася фабрыка труб і правадоў. З прычыны гэтага, на ўсіх выпадках звольнена некалькі тысяч рабочых.

Рэзкае скарачэньне зарплаты шаўцом у Вільні

ВІЛЬНЯ, 31. З прычыны рэзкага абвастрэньня экономічнага крызісу работадаўцы праводзяць скарачэньне зарплаты рабочым. Як паведамляе фашысцкі „Дзеньнік Віленскі", уласьнік магазыну гатовага абутку ў Вільні рэзка зьнізіў зарплату шаўцом, якія працавалі для яго магазыну. У адказ на гэта, рабочыя вырашылі з першага верасьня распачаць забастоўку.

Іскры радыё

* Гэтымі днямі на шматлюдным перавыбарным сходзе былы міністр загранічных спраў Латвіі, соцыял-дэмократ Цэленс вымушаны быў прызнаць што латвійска-савецкі дагавор даў работу 6000 прамысловых рабочых.

* У розных частках Францыі ідзе актыўная падрыхтоўка да міжнароднага тыдня моладзі. У сувязі з гэтай падрыхтоўкай узмацніўся прыток рабочай і сялянскай моладзі ў комсамол.

* Нязвычайныя паветраныя манэўры у раёне Найсі (Кітай) ў горадзе прайшоў мітынг, організаваны ўдзельнікамі імпэрыялістычнай вайны. Мітынг выліўся ў адзінадушную дэманстрацыю супроць падрыхтоўкі новай бойні.

* Арыштаваны рэдактар комуністычнай газэты „Дэпеш" (Францыя). Яму, прад'яўлена абвінавачаньне ў тым, што ён зьмясьціў артыкул у названай газэце аб дэманстрацыі новабранцаў.

* Пасьля выключнага братэрскага прыёму, аказанага турэцкімі уладамі і спартыўнымі організацыямі, яхта „Комсамоля" прыняла ўдзел у грэбных гонках на Босфоры.

* Партугальскі ўрад ужывае жорсткія рэпрэсіі супроць паўстанчага руху: Арыштаваныя паўстанцы будуць сасланы ў далёкія колёніі на катаржныя работы.

* У Більбао і Сантандэра (Італія) тэлефонныя правады перарэзаны. Губарнатар Сарагосы прадпісаў арыштаваць усіх бастуючых тэлефоністаў. Арыштавана ўжо 20 чалавек.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.



ОРГАН ЦБ ЛКСМБ

Агляд друку

НЕ КОНСТАТАВАЦЬ, А МОБІЛІЗОЎВАЦЬ

Падрыхтоўка да новага навучальнага году—надзвычайна важная палітычная задача. Бальшавіцкая падрыхтаўка да навучальнага, 4-га, заключнага году пяцігодкі, зьяўляецца важнейшай умовай для форсаванага вырашэньня задач культурнага будаўніцтва, для выкананьня грандыёзнай задачы на фронце ўсеагульнага навучаньня і політэхнізацыі школ.

Як-жа газэта піонэраў і школьнікаў БССР „Піонэр Беларусі" (орган ЦК ЛКСМБ) змагалася за бальшавіцкую падрыхтоўку да навучальнага?

„Піонэр Беларусі" пачала весьці падрыхтоўку да навучальнага году з чэрвеня месяца. І вяла гэтую працу не сыстэматычна, а з перабоямі, падаючы матар'ялы яўна нездавальняючай, як колькасьці, так і якасьці, не мобілізоўваючы як належыць, піонэраў і школьнікаў, якія ў першую чаргу зацікаўлены пытаньнямі школы на барацьбу за бальшавіцкую сустрэчу навучальнага.

Матар'ялы „Піонэра Беларусі" ў большасьці сваёй не мобілізуючыя, а констатуючыя. Напрыклад, 18 жніўня, у допісу пад зьбітым да млоснасьці шаблённым загалоўкам-„Мы б'ем трывогу", газэта піша:

> Брыгада піонэраў Капцэвіцкай базы праверыла ход падрыхтоўкі да новага навучальнага году.
>
> У мястэчковай ШКМ да гэтага часу няма падручнікаў, памяшканьне не адрамантавана, адсутнічаюць лаўкі для заняткаў.
>
> Комплектаваньне школ настаўнікамі па раёне, а таксама і ў наш ФЗС, не праведзена. Грамадзкія організацыі вакол пытаньня навучальнага году не мобілізаваны.
>
> Будаўніцтва новай школы ідзе чарапашымі тэмпамі.
>
> Такое становішча патрабуе найхутчэйшага рэагаваньня партыйных і савецкіх організацый раёну".

Такія допісы, толькі фотографуючыя, констатуючыя становішча, мы сустракаем даволі часта і, што горш за ўсё, рэдакцыя пускае такія матар'ялы нават без перадовак, без ацэнкі агульнага становішча падрыхтоўкі да навучальнага году.

Газэта ў некаторых нумарох абмяжоўвалася толькі адным артыкулам ці загадам, нават ня выпячваючы ў шапках пытаньня падрыхтоўкі да навучальнага.

Загад №3 начштабу 2-га ўсебеларускага зьлёту ЮП ЦК ЛКСМБ аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году нават без загалоўку.

Апошнія два нумары „Піонэра Беларусі" (ад 2 і 30 жніўня) з „многімі" матар'яламі. 26-га газэта дае разваротам на 2 старонкі клішаваную шапку: „Хутчэй рушым піонэрскі конвэер кантролю падрыхтаванасьці да навучальнага года". Складаецца ўражаньне, быццам газэта організавала конвэер, ці скразны кантроль над ходам падрыхтоўкі навучальнага. Але справа стаіць ня так. Рэдакцыя дала такую шапку таму, што гэта будзе лепш гучаць, што з словам „конвэер" шапка будзе парадней. Сама-ж газэта нават не опрабавала організаваць рэйд сваіх ударнікаў-дзяткораў па навучальнаму году.

Нумар ад 30-га жніўня фактычна прысьвечан пачатку навучальнага году. У гэтым нумары адразу чатыры даволі вялікія рэдакцыйныя артыкулы, якія забываюць увесь астатні матар'ял. Ня будзем спыняцца на гэтых артыкулах. Яны гавораць толькі аб двух пытаньнях; аб дзіцячым самакіраваньні і політэхнізацыі. Гавораць аб гэтым расплывуча і сьлізка.

Спынімся на перадоўцы нумару, якая павінна орыентаваць мобілізоўваць шматтысячную масу піонэраў і школьнікаў Беларусі на ліквідацыю прарываў у падрыхтоўцы да навучальнага году, мобілізоўваць на лепшую вучобу, на барацьбу за заваяваньне перабудовы школы на аснове сапраўднага політэхнізму супроць двухгодніцтва, супроць адставаньня.

Але перадоўка ня робіць гэтага. Перадоўка не мобілізоўвае на барацьбу за ліквідацыю прарываў у падрыхтоўцы да навучальнага, а наадварот-дэмобілізуе піонэраў і вучняў. У перадоўцы пішацца: „Усюды разгорнута ўдарная падрыхтоўка да сустрэчы новага навучальнага году". Гэта пішацца ў той час, калі ўвесь партыйна-комсамольскі друк БССР б'е трывогу аб тым, што яшчэ ня ўсюды рыхтуюцца па ўдарнаму да навучальнага, што яшчэ ў шмат якіх раёнах: Ельскім, Барысаўскім, Магілёўскім і інш., не па-ўдарнаму рыхтуюцца. Ды сам „Піонэр Беларусі" у гэтым-жа нумары, у процілегласьць перадавой, гаворыць аб тым, што „Гомельская піонэр-організацыя не па-ўдарнаму рыхтуецца да навучальнага году".

А перадавая супакойвае, дэмобілізоўвае. Моў, пашто напружваць сілы, на што старацца, калі „усюды разгорнута ўдарная падрыхтоўка да сустрэчы навучальнага году"?

> Перадавая, даючы гэткую няверную ацэнку стану падрыхтоўчай работы да навучальнага году, напісана дзяляцкі, Перадоўка апавядае толькі аб тым „як-жа павінен прайсьці першы дзень у школе", але ня ўзьнімае на політычную вышыню задачы піонэр організацыі і школьнікаў у сучасны момант, у момант пачатку навучальнага.

Ні словам газэта не абмовілася аб соцспаборніцтве ў школах, аб другагодніцтве, аб барацьбе з адставаньнем вучняў, аб задачах піонэраў і школьнікаў у час навучаньня. Газэта моўчкі абыходзіць пытаньне аб суцэльнай пісьменнасьці Беларусі к 1-му мая 1932 году.

На сёньняшні дзень перад газэтаю стаіць змаганьне за сапраўды політэхнічную сямёхгадовую школу, супроць двухгодніцтва, за школу сапраўднага інтэрнацыянальнага выхаваньня. Менавіта таму трэба зараз спыніцца на памылках і недахопах газэты, каб гэтыя памылкі і недахопы больш не паўтараліся.

„Піонэр Беларусі" павінен пакончыць з опортуністычнымі адносінамі да організацыі газэтнага матар'ялу. Трэба жыць не самацёчным матар'ялам, а організоўваць гэты матар'ял, кіраваць дзяткорамі.

> „Піонэр-Беларусі" павінен узяцца за мобілізацыю шматмільённай піонэрыі і школьнікаў Беларусі на яшчэ больш актыўны ўдзел трэцяга пакаленьня ў нацкультбудаўніцтве.

Паведамленьне

Сёньня 1-IX, а 7 гадз. увеч., адбудзецца пасяджэньне бюро цэнтральнай раб. літстудыі БелАПП'у

Яўка сяброў бюро абавязкова. Выклікаюцца т. т., падаўшыя заявы аб прыёме ў студыю

БЮРО.

ПОЛЬСКУЮ ПРАЦОЎНУЮ МОЛАДЗЬ КЛІЧАМ НА ЗЬЛЁТ

3-га верасьня ў памяшканьні Дому Працасьветы (Комуністычная вуліца) Менгарком ЛКСМБ, рэдакцыі газэт „Чырвоная Зьмена" і „Орка" склікаюць Агульна-гарадзкі Зьлёт Польскай працоўнай моладзі Менску, прысьвечаны XVII МЮД'у,

Менгарком ЛКСМБ
„Чырвоная Зьмена", „Орка"

УВАЗЕ КОЛЕКТЫВАЎ і ЯЧЭЕК

Менгарком ЛКСМБ надае вялізарнае палітычнае значэньне скліканьню агульна-гарадзкога зьлёту польскай працоўнай моладзі Менску. Зьлёт павінен зьявіцца магутным вагаром для выкананьня пастаноў апошняга кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ аб рабоце сярод польскай працоўнай моладзі, для ўзьняцьця на вышэйшую ступень удзелу працоўнай моладзі нацменшасьцяй у соцыялістычным будаўніцтве.

Таму Менгарком ЛКСМБ прапануе пад асабістую адказнасьць сакратароў каляктываў і ячэек ЛКСМБ неадкладна популярызаваць вялізарнае значэньне вышэпамянёнага зьлёту і забясьпечыць на даны зьлёт яўку комсамольцаў палякаў і ўсёй польскай працоўнай моладзі Менску.

Сакратар Менгаркому ЛКСМБ П. ЯНКОВІЧ

Друкарня імя тав. Сталіна.
Галоўлітбел № 599